**С. А. Сігаева**

# МІФАЛАГІЗМ ЯК МАСТАЦКІ СРОДАК

Міжкультурныя працэсы ў мастацтве і літаратуры вызначаюцца развіццём аксіялагічнай сферы чалавечага быцця. Яны закранаюць творчыя магчымасці пісьменніка і рэалізуюцца праз мастацкі міфалагізм. Канкрэтна-пачуццёвыя вобразы, матывы, сюжэты, сімвалы ўзнаўляюць як этнанацыянальныя ідэі, так і агульначалавечую культурную спадчыну, якая ляжыць у аснове міфалогіі. Такім чынам, вуснапаэтычная сістэма вобразаў і значэнняў з'яўляецца падмуркам міфатворчасці, выяўляе этнаментальныя асновы светапогляду і ўніверсальныя анталагічныя паняцці.

Літаратурная міфалагізацыя выступае як абагульняльная метафара і сродак літаратурнай паэтызацыі. Багацце нацыянальнай міфалогіі ў літаратуры сведчыць пра пэўную глыбіню адлюстравання калектыўнай свядомасці народа, пра ўзровень яго маральнага і духоўнага самавыяўлення. Ужо ў творчасці Міколы Гусоўскага яскрава выявілася тэндэнцыя непасрэднай міфалагізацыі і адкрытай паэтызацыі роднай зямлі. У "Песні пра зубра" зубр – гэта і сапраўдная жывёла Белавежскай пушчы, і алегарычны вобраз роднага краю. Звяртаўся да міфаў і Францыск Скарына, выкарыстоўваючы прытчавы і біблейны змест для маральнага выхавання і духоўнага развіцця народа. Сувязь зместу літаратурных твораў пачатку ХХ ст. з міфалогіяй і фальклорам захоўваецца, але яна яшчэ ў большай ступені, чым у ХІХ ст., ускладняецца літаратурнай традыцыяй, пераасэнсоўваецца пад шматлікімі эстэтычнымі ўплывамі, пад уздзеяннем задачаў публіцыстычнай надзённасці. Супярэчнасць паміж патрыярхальным і агульначалавечым набывае выразнае драматычнае абвастрэнне (творы Цёткі, Ядвігіна Ш.). У творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага міфалагічныя і фальклорныя матывы робяцца разгорнутым літаратурным вобразам.

У творах Янкі Купалы міфалагізуецца мінулае народа як адзнака жывасці яго душы, што ўплывае на сучаснае духоўнае развіццё Беларусі (вобраз духа абуджэння ў вершы "Сон"). Вобраз кургана ў творчасці паэта мае міфалагічнае паходжанне і з'яўляецца алегорыяй духоўнага ўзвышэння, яднання мінулага і сучаснага. У паэме "Сон на кургане" найбольш ярка выявіўся працэс літаратурнага падпарадкавання міфалагічных асацыяцый і рэмінсцэнцый надзённым творчым задачам. Вобразы, сюжэтныя матывы, прылады і інструменты ў паэме маюць даўні, традыцыйны, абагульняльны міфалагічны сэнс барацьбы дабра і зла, узнёслага і нізкага, духоўнага і прыземленага.

У творчасці Якуба Коласа схільнасць да міфалагізацыі фігураў не такая выразная, як у Янкі Купалы; аднак традыцыйнае ў яго творах займае вялікае месца, асабліва ў апісанні побыту і працы селяніна як спрадвечнага рытуалу, існаванне якога мае міфалагічнае паходжанне. Гэта ў нейкай ступені збліжае паэму "Новая зямля" з творамі антычных аўтараў (Гамер), якія міфалагізавалі сялянскі побыт і працу.

У вершах Максіма Багдановіча міфалагічныя персанажы (вадзянікі, русалкі, змяіны цар) не валодаюць той злавеснай сілаю і варожасцю да чалавека, што ўласцівыя адмоўным міфалагічным персанажам Янкі Купалы; яны заўсёды былі светлымі, лёгкімі духамі роднай зямлі.

Беларуская літаратура пачатку ХХ ст. перажывала перыяд найбольш інтэнсіўнага ідэйна-мастацкага асваення міфалагічнай і фальклорнай спадчыны. Гэты працэс у 1905–1917 гг. набыў асаблівую маштабнасць і складанасць. Творчае стаўленне да міфа і фальклору ў гэты час, як ніколі раней, падпарадкоўваецца галоўнай канцэпцыі эстэтычнага развіцця, выяўляе асноўны пафас нацыянальнага станаўлення мастацкай літаратуры.

Мастацкія тэксты гэтых творцаў адзначаюцца ўкараненнем у беларускую фальклорна-міфалагічную традыцыю, што рэалізуецца у сімвалічным сэнсе канкрэтна-пачуццёвых вобразаў мастака. Мастацкая карціна свету пісьменнікаў звяртаецца да міфалагічна-этнаментальных прынцыпаў беларускага народа. Яна цесна звязана з народнай традыцыяй, дэманструе неаднароднасць і багацце мастацкага сплаўлення фальклорнай традыцыі. Творы адрозніваюцца рознай насычанасцю міфалагічна-фальклорнымі матывамі і вобразамі, у іх рэалізуецца міфалагічны код праславянскай культуры.

Міфатворчасць – універсальная і сталая катэгорыя, якая непасрэдна ўплывае на псіхіку чалавека. Па словах А. Весялоўскага, "процесс, который осуществляется в голове человека, который создал миф, тот же, что происходит в голове современного поэта". Фізіялагічныя і псіхалагічныя працэсы архаічнай псіхікі, якія спарадзілі міфы, паводле К.-Г. Юнга, тоесныя тым працэсам, якія дзейнічаюць у падсвядомасці сучаснага чалавека. Вучоны даказаў існаванне архетыпаў ў рамках калектыўнага падсвядомага, што рэалізуецца ў снах, неўрозах, трызненні і творах мастацтва. Калектыўнае падсвядомае – не толькі праява мінулага, а таксама сховішча "зародышей будущих психических ситуаций и идей". Вобразны тып мыслення мастака ляжыць у цэнтры ўзаемадзеяння вуснапаэтычнай традыцыі і міфалогіі. В. Фрэйдэнберг адзначае: "Основную роль при переходе мифологии в фольклор играло нарождение реалистического мировосприятия в форме понятий. Понятия выветривали из мифа его конкретные и прямые смыслы. Это и закладывало основу фольклора, который тщательно воспроизводил все наследие мифологии, понятое, однако, реалистическим мировосприятием". Такім чынам, у літаратурным творы раскрываецца творчы патэнцыял аўтара, які эксплікуецца праз фальклорна-міфалагічныя вобразы, матывы, сюжэты.

Фальклорна-міфалагічныя сістэмы каштоўнасцяў як спосабы асэнсавання свету адрозніваюцца адна ад адной, а міфалагічны вобраз або міфа-

лагічнае ўяўленне з’яўляюцца семантычнай рэакцыяй першаснай думкі на пачуцці аб’екта менавіта ў яго пачуццёвай прысутнасці. У паэзіі беларускіх творцаў назіраецца сінтэз архаічнага разумення навакольнага асяроддзя і асабістага светапогляду. Можна таксама канстатаваць сінкрэтычнае ўспрыманне вобразаў, якое адначасова спалучае ў сабе зрокавыя, тактыльныя і акустычныя адчуванні. Да апошніх мы адносім, напрыклад цішыню як супрацьлегласць гуку, які таксама ўспрымаецца пачуццёва. Ці вобраз зорак і месяца. Можна трактаваць месяцовыя вобразы як жаночыя сімвалы, што характэрна для сусветнай светапогляднай традыцыі, у той час як у праславянскіх вераваннях месяц выступае ў мужчынскім абліччы. Нашы продкі выкарыстоўвалі вобраз зорак у замовах. Адпаведна, да гэтых астральных свяцілаў звярталіся ў рытуалах, алюзія на якія ў вершах Максіма Багдановіча і Янкі Купалы прадстаўляе згадкі пра забытыя гульні, якія часта ляжаць у аснове рытуалаў. В. Тэрнер паказваў на міфапаэтычнае паходжанне рытуалаў, адзначыўшы, што гэта “стереотипная последовательность действий, охватывающих жесты, слова и объекты, исполняемые на специально подготовленном месте и предназначенные для воздействия на сверхъестетсвенные силы или существа в интересах и целях исполнителей; ритуалы могут быть сезонными, зависящими от обстоятельств, по случаю бедствия, гадания, церемонии посвящения, жертвоприношения”. Так, Э. Касірэр, звязваючы міфалагічную свядомасць з перыядычнасцю і рытмам чалавечага быцця, казаў, што “с этим тесно связаны ритуалы перехода из одной жизненной фазы в другую; рождение и смерть, беременность и материнство, вступление в брак и т.д. приобретают здесь специфический смысл; в каждой фазе выявляется другое «я» человека и индивидуальная жизнь выглядит как смена рождений и смертей”. Гэтак жа ўскосна можна патлумачыць ужыванне вобраза ільну праз расшыфроўку сімволікі гэтага архетыпа, які ў народнапесеннай традыцыі ўвасабляў дзявочую прыгажосць і цнатлівасць, а таксама быў сімвалам шлюбу ў даўнія часы, бо выкарыстоўваўся ў абрадавых песнях.

Мастацкае міфамысленне сублімавана сінкрэтычнай першабытнай культурай. Міфалагічна-фальклорныя вобразы адпавядаюць міфалагічна-абрадавай сферы нацыянальнай традыцыі, валодаюць пэўным комплексам прыкмет, якія з’яўляюцца асновай сэнсава-функцыянальнай пераарыентацыі ў ходзе трансфармацыі ў літаратурны кантэкст, што выяўляецца ва ўзнікненні або зрушэнні этыка-эстэтычных сэнсавых узроўняў, пашырэнні семантычнага поля, трансфігурацыі асноўных рыс, “эўфемізацыі” і індывідуалізацыі вобраза. Такім чынам, у паэтычнай творчасці назіраюцца пераасэнсаванне традыцыйнага светапогляду беларускага народа, вуснапаэтычнай сімволікі; індывідуальна-аўтарская інтэрпрэтацыя міфалагічных вобразаў, матываў і сюжэтаў, расшыфроўка якіх патрабуе інтэлектуальнай падрыхтоўкі чытача.

Можна казаць пра міфалагізм мастацкага мыслення як сукупнасць трансфармаваных у слоўна-мастацкай сістэме ідэй, вобразаў, матываў, якія бяруць пачатак з міфа і закранаюць ідэйна-сімвалічны змест літаратурнага твора; як прыём паэтычнай арганізацыі матэрыялу ў літаратурным творы

праз выкарыстанне сістэмы вобразаў, блізкай да пабудаванай міфалагічным мысленнем або семантычна трансфармаванай у нетрах вусна-паэтычнай творчасці (міфалагічны фальклярызм), якая ў творы выступае як мастацкі сродак выражэння пэўных самабытных, устойлівых нацыянальных духоўных канстант, паглыблення сэнсавых узроўняў твора. Такім чынам, міфапаэтычная мадэль свету ў беларускай літаратуры характарызуецца культурнай стэрэатыпнасцю і ўскладняецца семантычнымі мадыфікацыямі індывідуальна-аўтарскага эмпірычнага вопыту. Пераасэнсаванне міфалагічных матываў на аснове народнапесеннага матэрыялу ў лірыцы прывяло да ўскладнення метафарызацыі і паўплывала на фарміраванне асаблівай паэтычнай манеры творцаў. Вобразнае напластаванне на традыцыйную вуснапаэтычную сімволіку паглыбляе і трансфармуе этнаментальныя анталагічныя ўяўленні, рэалізуючы непаўторны міфалагічны свет пісьменнікаў.